**Пашковіч, Л.** Сонца здавалася чорным / Л. Пашковіч // Веснік Глыбоччыны. — 1998. — 14 лют. — С. 2.

## СОНЦА ЗДАВАЛАСЯ ЧОРНЫМ

15 лютага – жалобны маркотны дзень. Але ён ёсць, яго нельга выкінуць з памяці. Вайна ў Афганістане, удзел у ёй нашых воінаў застаецца спрэчнай і незразумелай. Пройдуць гады, і гісторыкі па-сапраўднаму ацэняць яе, раскажуць праўду. А пакуль аб ёй мы ведаем вельмі мала. Адно бясспрэчна – шмат маладых жыццяў загубіла гэтая неаб'яўленая вайна, шмат скалечыла лёсаў. Пакінула і на нашай беларускай зямлі сірот і ўдоў. І сёння хлопцам, якія па волі лёсу трапілі ў Афганістан, у снах бачыцца чужая гарыстая зямля, чуецца страляніна, пах горкага ядавітага дыму, які закрываў сонца і яно здавалася чорным.

Напярэдадні Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў пазнаёмілася з Багданам Іванавічам Тумашам, глыбачанінам. Працуе ён на чыгуначным вакзале прыёма-здатчыкам. Паўтара года прыйшлося Багдану Іванавічу служыць у Афганістане. Цяжкі гэта шлях і для жыцця, і для ўспамінаў. Хоць і прайшло з таго дня шмат год, але добра памятаецца 1985, пачатак лета. Толькі што здадзены апошні экзамен за другі семестр у Магілёўскім тэхналагічным інстытуце, у які паступіў ён пасля заканчэння Глыбоцкай СШ № 1. Добра было б крыху падзарабіць да студэнцкай стыпендыі. Але так не атрымалася. Споўнілася 18 год, уручана павестка з ваенкамата, прыпынена вучоба ў інстытуце, пачынаецца служба ў арміі, разлічаная на 2 гады. Быў такі закон.

У першыя дні службы вучэбка на Паўднёвым Урале ў Чэлябінскай вобласці. Шэсць месяцаў прайшлі хутка. Багдан стаў малодшым сяржантам мотастралковага падраздзялення. Было аб'яўлена, што гэтае падраздзяленне рыхтуецца для ўдзелу ў ваенных дзеяннях у Афганістане. Ды і падрыхтоўка была вельмі сур'ёзная. Бесперапынныя трэніроўкі на стрэльбішчы. Камісія адбірала толькі моцных хлопцаў. У Багдана Іванавіча са здароўем і з воінскай падрыхтоўкай усё аказалася нармальна. Праз суткі іх падраздзяленне прызямлілася ў Ташкенце.

Вось тут і здрыганулася сэрца маці. Ён жа ў яе адзін. Бацька памёр, калі Багдан яшчэ ў школу не хадзіў. Маці адна гадавала, песціла сына, радавалася яго поспехам у школе, паступленню ў інстытут. На першым курсе дапамагала, чым толькі магла, аддавала апошняе, каб толькі вучыўся сынок. А вось як усё абярнулася. Не студэнт, а воін. Але загад Радзімы ёсць загад. Багдан ні на крок не адступіў, дастойна праявіў сябе ў вучэбцы, не хаваўся за чужую спіну. Ён верыў, што маці яго зразумее, толькі нялёгка ёй будзе чакаць сына з вайны.

На двары стаяў кастрычнік. У Кабуле ярка свяціла сонца, нагадваючы нашы май-чэрвень. Але промні яго не неслі радасці. Яны асвечвалі калючы дрот, суровыя позіркі салдат са зброяй, ваенныя машыны і горы, у якіх клубіўся чорны дым. Як потым даведаўся Багдан, дагараў збіты душманамі наш верталёт з салдатамі. Вось яна, вайна, не фільм у кіназале. Вайна наяву...

Багдан Іванавіч не ахвотна ўспамінае перажытае. У далёкім Афганістане салдат падсцерагалі не толькі кулі душманаў, але і розныя хваробы – халера, малярыя, гепатыт. Багдану Іванавічу пашчасціла ўцалець ад кулі, але два разы перахварэў на гепатыт. Здароўе вельмі пахіснулася. Аднак Багдан Іванавіч знайшоў у сабе сілы, здолеў падлячыцца, вызначыў свой далейшы лёс у жыцці.

Багдану Іванавічу добра працуецца, бо, па яго словах, акружаюць людзі шчырыя, сардэчныя,

спагадлівыя. Адчувае ён цёплыя адносіны і з боку начальніка чыгункі Віктара Фёдаравіча Капыленкі. Яго заўседы падтрымліваюць маральна, а гэта вельмі многае значыць. І Багдан Іванавіч удзячны свайму калектыву.

Раней часта пісалі ў газетах аб хлопцах, якія ваявалі ў Афганістане. Маўляў, не змог пасля дэмабілізацыі ўліцца ў мірнае жыццё, запіў, не хоча нічым займацца.

Праўда, Багдан Іванавіч не вельмі гэтаму верыў. Пакуль сам не сустрэў такога хлопца на вакзале ў Мінску. Той, падышоўшы да Тумаша, папрасіў грошай.

– А чаму ты іх просіш? Запытаў Богдан.

– Я – былы афганец, я ваяваў, – закрычаў хлопец.

Багдан Іванавіч, адвёўшы крыху ўбок хлопца, пачаў з ім гаварыць: «Дзе служыў, у якія гады, чаму нідзе не ўладкаваўся на работу, чаму не вярнуўся да жыцця?»

Багдан Іванавіч расказаў, што хлопец гэты сапраўды быў у Афганістане, адказы яго гэта пацвердзілі. Да нармальнага жыцця той вярнуцца не змог. Не знайшоў сілы. Яму ўсё здаецца, што ён паміж жыццём і смерцю. Параіў Тумаш свайму аднагодку пераадолець самога сябе. Агледзецца, пайсці абавязкова працаваць. Знайсці сваё каханне. Багдан Іванавіч купіў яму білет дадому, пасадзіў у прыгарадны аўтобус і развітаўся.

***

На маё пытанне, а што значыць для яго, Багдана Іванавіча, Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, адказаў, што маладзёжны аддзел наладжвае сустрэчу былых воінаў-інтэрнацыяналістаў. Праходзіць яна заўсёды цікава. Багдан любіць сустракацца з былымі афганцамі, наведавацца ў парк Перамогі і пакласці да падножжа помніка загінуўшым афганцам кветкі.

А яшчэ дома запаліць свечку ў памяць сяброў, якія загінулі на афганскай вайне. І няхай яна асвеціць кароткае зямное жыццё. Наогул жа Багдан Іванавіч за тое, каб ніколі промні сонца не засціналіся чорным дымам, каб не клалі на вайне свае галовы 18-гадовыя хлопцы.

**Лідзія ПАШКОВІЧ**